Community-led Urban Strategies in Historic Towns (COMUS)

COUNCIL OF EUROPE

Funded
by the European Union
and the Council of Europe

EUROPEAN UNION

CONSEIL DE L'EUROPE

Implemented
by the Council of Europe

**Урбаністычныя стратэгіі гістарычных гарадоў,**
**арыентаваныя на супольнасці** (COMUS)”

# Тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне

# Рэстаўрацыя будынкаў былога езуіцкага калегіўма
# і эфектыўнае іх выкарыстанне для развіцця горада Мсціслава

**Мсціслаў**

**Рэспубліка Беларусь**

**Сакавік** 2017

OVPM
OWHC
OCPM

## ЗМЕСТ


1. Назва аб’екта 3
2. Уводзіны 4 – 5
3. Апісанне аб’екта 6 – 7

3.1. Апісанне аб’екта і яго кампанентаў 6
3.2. Адміністратыўная інфармацыя 7
3.3. Патрэбы і патрабаванні 7- 8
4. Абмежаванні і магчымасці 8 – 10
4.1. Устаноўленая законам ахова/ абмежаванні 8 - 9
4.2. Магчымасці для пашырэння існуючага выкарыстання і паўторнага функцыянавання 9 – 10

5.Апісанне праекта 11 – 12
5.1 План праекта 11 - 12
5.2 Кароткі агляд канцэпцыі праекта 12

6. Распрацоўка праекта 12 – 17
6.1 Ацэнка дзейнасці 10 – 16
6.2 Фінансаванне 16 – 17
6.3 Экалагічнае і сацыяльнае ўздзеянне 13 – 14
6.4 Рызыкі 18
6.5 Сцэнарыі развіцця праекта 18 -- 19
6.6. Кіраванне і ўстойлівасць 20

7.SWOT аналіз 21

8. Бібліяграфія 22

9. Дадаткі 23 – 36

1. **Назва аб'екта: Ансамбль Езуіцкага калегіўма**









*Размяшчэнне ў гістарычным цэнтры Мсціслава*

*Размяшчэнне на месцы*

2. **Уводзіны**

Дзейнасць па аднаўленню ансамбля былога Езуіцкага калегіўма і стварэнне на яго базе ўстановы новага тыпу – мультыкультурнага кластэра ажыццяўляецца ў г. Мсціславе (Беларусь), які з 2015 г. з'яўляецца пілотным горадам сумеснага праекта Рады Еўропы і Еўрапейскага Саюза "Урбаністычныя стрэтэгіі гістарычных гарадоў, арыентаваныя на супольнасці (COMUS)", заснаванага на палітычных прыярытэтах Праграмы Усходняга партнёрства (2015-2020 гг.).

Праект COMUS рэалізуецца ў шасці краінах, сярод якіх: Арменія, Беларусь, Грузія, Рэспубліка Малдова і Украіна і 9 гістарычных гарадах. Ён накіраваны на комплексную рэабілітацыю дадзеных гарадоў на падставе захавання і выкарыстання культурнай і прыроднай спадчыны. Праект прадстаўляе пілотным гарадам эфектыўную падтрымку і экспертныя веды Савета Еўропы, а таксама Арганізацыі гарадоў Сусветнай спадчыны ў справе мабілізацыі рэсурсаў спадчыны ў якасці эфектыўнага інструмента адраджэння гэтых гарадоў, спрыяе шматбаковаму міжнароднаму супрацоўніцтву і абмену вопытам.

Мсціслаў як пілотны горад праекта COMUS валодае значным патэнцыялам спадчыны і шырокімі магчымасцямі для развіцця ўстойлівага турызму. Гэта адзін са старажытных гарадоў Беларусі, які быў заснаваны ў 12 ст. На яго тырыторыі размяшчаюцца больш 40 помнікаў гісторыі і культуры міжнароднага, нацыянальнага і мясцовага значэння, у тым ліку археалагічныя месцы, старажытныя цэрквы і манастыры, фартыфікацыйныя збудаванні, гістарычныя будынкі і аб'екты ландшафтнай архітэктуры.

Рэабілітацыя гістарычнага цэнтра, што адлюстроўвае спецыфіку горада і з'яўляецца прадметам гонару яго жыхароў, -- прыярытэтны кірунак гарадской палітыкі Мсціслава. Вось ужо цягам некалькі гадоў гарадскія ўлады укладваюць вялікія сродкі ў рэгенерацыю гістарычнай тэрыторыі, рэстаўрацыю і кансервацыю помнікаў архітэктуры і археалогіі. Быў створаны мясцовы дабрачынны фонд для захавання культурнай спадчыны, які таксама збірае і акамуліруе грамадскія сродкі для гэтых мэтаў. Тым не менш, магчымасці невялікага правінцыйнага горада, якім сёння з'яўляецца Мсціслаў, абмежаваныя, асабліва ў дачыненні да тых аб'ектаў спадчыны, што некалі складалі славу гэтага горада, сведчаць аб яго вялікім палітычным і эканамічным значэнні ў пэўныя гістарычныя перыяды, а зараз знаходзяцца ў нездавальняючым стане і патрабуць даволі значных укладанняў. Неабходна не толькі захаваць і адрэстаўраваць гэтыя помнікі, але і ўдыхнуць у іх новае жыццё, прыстасаваць пад новыя, сацыяльна значныя мэты, рэалізацыя якіх паспрыяе устойліваму развіццю горада і ўзмацніць яго культурны і эканамічны патэнцыял.

У рамках праекта COMUS, шляхам шматлікіх абмеркаванняў і кансультацый, якія праводзіліся з мясцовымі зацікаўленымі асобамі, прадстаўнікамі гарадскіх уладаў, асобнымі спецыялістамі, былі абраныя два прыярытэтныя праекты, якія ў выніку іх рэалізацыі, змогуць унесці значыны ўклад у развіццё горада. Гэта праекты рэабілітацыі ансамбля езуіцкага калегіўма і былой мужчынскай гімназіі.

Выбар гэтых аб'ектаў быў абумоўлены, па-першае, іх месцапалажэннем – у самым цэнтры горада, акрамя таго, аб'яднаных агульнай прасторай – гарадскім скверам і плошчай вакол сквера і абодвух комплексаў; па-другое, іх высокім гісторыка-культурным значэннем і эстэтычнымі якасцямі (яны з'яўляюццв архітэктурнымі дамінантамі ў горадзе); па-трэцяе, іх магчымасцямі ў вырашэнні шматфункцыянальных задач (вялікія плошчы гэтых аб'ектаў дазволяць пасля іх рэабілітацыі выкарыстоўваць іх з найбольшай эфектыўнасцю для горада).

Дадзенае тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне (ТЭА) ствараецца з мэтай аднаўлення ансамбля Езуіцкага калегіўма ў Мсціславе на падставе яго гістарычнай, сацыяльнай і культурнай ролі для горада. Мяркуецца поўная рэстаўрацыя будынкаў калегіўма з акаляючай тэрыторыяй і стварэнне на яго базе мультыкультурнага кластэра. Асноўнай прычынай прыярытэтнасці гэтага праекта з'яўляюцца магчымасці для сацыяльнага-эканамічнага развіцця горада. Праект прапануе розные сцэнарыі для мясцовай моладзі па рэалізацыі іх прафесійнай арыентацыі і правядзенні вольнага часу. Гэты праект таксама валодае патэнцыялам для атрымання дахода ад камерцыйнай і турыстычнай дзейнасці, што істотна для мясцовых уладаў і насельніцтва.

Прыярытэты, вызначаныя для гэтага аб’екта, ўключаюць неабходнасць паляпшэння існуючай інфраструктуры, а таксама дэфрагментацыю тэрыторыі шляхам інтэграцыі яе элементаў у адзіны культурны ландшафт. Таксама разглядаюцца канкрэтныя пытанні, такія як вырашэнне экалагічных праблем, ландшафтны дызайн, навігацыя, выбар каларыстычнага коду места, доступ да аўтатранспарту і інш.

Чакаецца, што рэалізацыя праекта зойме чатыры гады, першы з якіх -- падрыхтоўчы. На працягу гэтага года існуючыя праблемы будуць прааналізаваныя і прапанаваны рашэнні ў рамках шэрагу мерапрыемстваў з прыцягненнем супольнасці і тэхнічных экспертаў. Тры наступныя -- для рэалізацыі канкрэтных рэстаўрацыйных і рэвіталізацыйных дзеянняў.

Даследаванне складаецца з пяці раздзелаў, якія змяшчаюць кантэксную інфармацыю, асноўныя абмежаванні і магчымасці для развіцця, падрабязнае апісанне праекта і чаканыя вынікі. ТЭА звязаны з задачамі праекта рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Мсціслава, якая працягваецца. Крыніцы інфармацыі ўключаюць існуючыя гарадскія планы і праграмы развіцця Мсціслава, кадастравыя і архіўныя планы, планы тэхнічных службаў, гістарычныя дакументы і фатаграфіі, а таксама ітнэрнэт і друкаваныя публікацыі. Юрыдычныя падставы таксама ўлічваліся ў працэсе распрацоўкі канцэпцыі праекта

У дадзеным тэхніка-эканамічным абгрунтаванні асноўная ўвага надаецца аднаўленню будынкаў былога Езуіцкага калегіўма. Ёсць рашэнне мясцовых жыхароў ператварыць былы езуіцкі калегіўм у мультыкультурны кластэр з Арт-рэзідэнцыяй (у канвікце), хостэлам (у будынку калегіўма), бізнэс-інкубатарам для творчых моладзевых ініцыятыў (у будынках былых гаспадарчых пабудоў), канцэртным холам ў будынку былога касцёла.

Дакумент быў распрацаваны Людмілай Кірыенака, дырэктарам Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея па ініцыятыве Мсціслаўскай стэйкхолдэргрупы, на падставе матэрыялаў Плана кіравання, адпаведнай тэхнічнай дакументацыі, пры кансультацыі тэхнічных дарадцаў (архітэктараў і рэстаўратараў). ТЭА заснаваны на папярэдняй тэхнічнай ацэнцы (ПТА), якая адлюстроўвала наступныя пытанні:

- апісанне аб’екта ў культурным ландшафце горада;
- яго жыццяздольнасць (кіраванне і ўстойлівасць);
- стратэгічныя задачы (адаптыўнасць, карыстальнікі, аўдыторыя, рынак).

Даследаванне ўключае ў сябе план мерапрыемстваў і меркаваны бюджэт, які складае € 12 186 500 Канчатковы варыянт дакумента быў разгледжаны па пасяджэнні Групы па кіраванню праектам г. Мсціслава 16.05.2017 г. Працэс распрацоўкі ТЭА каардынаваўся Мэнаджарам праекта і Нацынальным каардынатарам.

## 3. АПІСАННЕ АБ’ЕКТА

### 3.1. Апісанне аб’екта і яго кампанентаў

Ансамбль Езуіцкага калегіўма – гэта комплекс будынкаў 18–19 стст., які ўключае ў сябе аб’екты рознай каштоўнасці і памераў. Найперш – касцёл св. Міхаіла Архангела, помнік барока, які вырашаны магутнай мураванай базілікай з трансептам і двухвежавым фасадам. З поўначы да касцёла далучаецца аднапавярховы будынак былой аптэкі

езуітаў, з поўдня да апсіды – двухпавярховы, прамавугольны ў плане корпус калегіўма. Акрамя таго, захаваліся гаспадарчыя пабудовы, канвікт (будынак пансіёну), агароджа ў рамантычным стылі (канец 19 ст.) і капліца. Калегіўм быў заснаваны напачатку 17 ст. па загаду караля Жыгімонта Трэцяга Вазы, быў драўляны, у 18 ст. пабудаваныя каменныя будынкі.

Асноўнай дамінантай Мсціслаўскага калегіўма езуітаў з'яўляецца касцёл  архангела Міхаіла. Будынак касцёла ўяўляе сабой трохнефавую базіліку з трансептам і двувежавым галоўным фасадам. Галоўны фасад падзяляецца на два ярусы і завяршаецца развітым антаблементам са ступечатым атыкам ў цэнтры. Сцены будынка аздоблены шырокімі пілястрамі. Вежы захаваліся часткова. У час  рэканструкцыі касцёла пад праваслаўны сабор у 19 ст. быў узведзены вялікі паўсферычны купал на цыліндрычным светлавым барабане ( не захаваўся). Захаваліся рэшткі насценнага жывапісу.

Аднапавярховы  цагляны будынак аптэкі мае  прамавугольную форму с выступаючай паўкруглай часткай памерамі 19.62 x 10.875м. Сцены зроблены з чырвонай цэглы, з драўляным перакрыццем. Падвал адсутнічае; гарышча ў аб'еме скатнага вальмавага даху, з  драўлянай страпільнай сістэмай; пакрыцце даху са  сталі фальцавага злучэння. Унутраны аб'ем ўяўляе сабой адзінкавае памяшканне з вышынёй больш чатырох метраў. Вокны і дзверы драўляныя, прамавугольнай формы. Фасады атынкаваныя з дэкорам па карнізе даху. Зараз будынак закансерваваны.

Будынак калегіўма  -- двухпавярховы, цагляны. Па форме нагадвае выцягнуты прамавугольнік. У паўднёвай частцы ён злучаецца пад невялікім вуглом з касцёлам. Паўночна-усходняя сцяна аздоблена кантрафорсамі. Сістэма планіроўкі – калідорная, з аднабаковым размяшчэннем памяшканняў. На першым паверсе калідор і пакоі перакрыты крыжовымі скляпеннямі, на другім – плоскай столлю. На усходнім куце  знаходзіцца  вузкая двухмаршавая лесвіца.

Канвікт – будынак пансіёну, трохпавярховы, прамавугольны ў плане. Размешчаны злева перад галоўным фасадам касцёла. У 1960-я гг. Да яго быў прыбудаваны трохпавярховы будынак  музычнай школы. Сёння будынак канвікта рэстаўруецца і плануецца выкарыстоўваць яго ў бліжэйшай перспентыве для патрэб мастацкай адукацыі дзяцей.

Гаспадарчыя пабудовы пабудаваны ў 19 ст. Зараз тут размяшчаецца мастацкая школа

### 3.2. **Адміністратыўная інфармацыя**

3.2.1 Краіна ці тэрыторыя:  Рэспубліка Беларусь

3.2.2 Кантактныя асобы: Наталля Біскуп, Людміла Кірыенка

3.2.3 Email address: okinchits.mst@tut.by, irmaultra@yandex.by

3.2.4 Назва і адрас аб'екта: Ансамбль Езуіцкага калегіўма, адрас: г. Мсціслаў 213453, Магілёўская вобл, на рагу вул. Першамайскай і Пралетарскай

3.2.5 Шыфр у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь:  512Г000510

3.2.6  Будынак / Помнік / Тып помніка: Помнік  архітэктуры нацыянальнага   значэння, 2 катэгорыя

3.2.7 Сучаснае выкарыстанне: У адным з адноўленых будынкаў размясцілася дзіцячая мастацкая школа. Будынак канвікта рэстаўруецца. Там  размесціцца дзіцячая музыкальная школа.  У будынку калегіўма зараз размяшчаецца ведамасны гатэль адзела адукацыі Мсціслаўскага райвыканкома. Усе астатнія будынкі  калегіўма  патрабуюць рэстаўрацыі.

3.2.8 Форма ўласнасці: Касцёл Святога Міхаіла Архангела знаходзіцца на балансе Мсціслаўскага раённага гісторыка -археалагічнага музея; Будынкі калегіўма, канвікста і гападарчыя будынкі  належаць Аддзелу адукацыі Мсціслаўскага раённага выканаўчага камітэта; будынак аптэкі – уласнасць установы адукацыі "Дзіцячая школа мастацтвау імя Н.Н Чуркіна"  г.Мсціслава.

3.2.9 Адказныя ўлады:

- Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
- Мсціслаўскі раённы выканаўчы камітэт
- Мсціслаўскі гісторыка-археалагічны музей
- Аддзелы адукацыі і культуры Мсціслаўскага райвыканкама

## 3.3. **Патрэбы і патрабаванні**

Ансамбль Мсціслаўскага Езуіцкага калегіўма і сквер, які прымыкае да яго, знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад вялікай колькасці помнікаў, што, безумоўна, спрыяе павышэнню каштоўнасці ансамбля як культурна-гістарычнай спадчыны горада і рэгіёна. Езуіцкі калегіўм размешчаны ў гістарычным цэнтры Мсціслава, недалёка ад галоўнай плошчы. Насупраць знаходзіцца будынак былой мужчынскай гімназіі, які абраны намі ў якасці другога прыярытэтнага праекта рэабілітацыі ў рамках праекта COMUS. На поўдзень ад калегіўма знаходзіцца будынак былой жаночай гімназіі, былыя гатэлі «Эрмітаж», «Лондан» і «Парыж», з поўначы – царква Аляксандра Неўскага, гандлёвыя рады і шэраг іншых будынкаў 18-19 стст. , а таксама традыцыйная гарадская драяўляная забудова. Практычна з 19 ст. планіровачная структура Мсціслава не змянілася, усе будынкі знаходзяцца на сваіх ранейшых месцах і ўтвараюць адзіны ансамбль. Усе гэтыя активы могуць быць інтэграваны ў адзіны турыстычны маршрут, звязаны з гісторыяй горада. Езуіцкі калегіўм з'яўляецца цэнтральнай дамінантай гістарычнага цэнтра, ён прываблівае гасцей горада і турыстаў нават у сучасным неадрэстаўраваным стане, але пасля рэабілітацыі можа стаць ключавым звяном маршрута.

На дадзены момант з ансамбля Мсціслаўскага езуіцкага калегіўма захаваліся: касцёл Святога Міхала Архангела, будынак калегіўма, канвікт, аптэка, гаспадарчыя будынкі, плот і капліца. Частка будынкаў адрэстаўравана (гаспадарчыя будынкі і капліца), у іх сёння размяшчаецца дзіцячая школа мастацтваў; рэстаўруецца будынак канвікта (пансіёна). У бліжэйшай перспектыве тут плануецца размясціць адзін з аддзелаў музычнай школы. У будынку калегіўма размяшчаецца ведамасны гатэль гарадскога аддзела адукацыі на 40 месцаў, але будынак патрабуе рамонту. У 2016 г. за гарадскія сродкі быў распрацаваны праект рэстаўрацыі аптэкі, яго рэалізацыя мяркуецца ў 2017 -- 2018 г.

У найгоршым фізічным стане знаходзіцца будынак касцёлу Св. Міхаіла Архангела, выдатны помнік барочнай архітэктуры. Працы па яго рэканструкцыі пачаліся ў 2000 г. (былі праведзены гістарычныя і архітэктурныя даследаванні, пачалася рэстаўрацыя вежаў), аднак, з-за недахопу сродкаў, рэстаўрацыйныя працы былі спынены, аб’ект закансерваваны. Пасля рэстаўрацыі плануецца аднавіць арган і адкрыць у ім Канцэртную залу.

У 2017 г. таксама было праведзена добраўпарадкаванне тэрыторыі калегіўма і акаляючай прасторы сквера і гарадскога цэнтра. Тым не менш, пасля завяршэння работ па добпаўпарадкаванню засталося шмат пытанняў адносна адэкватнасці зробленага гістарычнаму кантэксту і захаванню аўтэнтычнасці (ужыванне нетрадыцыйных матэрыялаў, унясенне зменаў у гістарычны план і інш.), што, безумоўна, патрабуе перагляду пры ажыццяўленні далейгай рэвіталізацыі комплексу.

Сёння функцыянальнае значэнне будынкаў калегіўма сканцэнтравана ў асноўным на вырашэнні праблем дзіцячай мастацкай адукацыі і часткова выконвае сацыяльныя функцыі (гатэль). Пасля рэстаўрацыі былой мужчынскай гімназіі і прыстасаванню яе пад гарадскі адукацыйны цэнтр для дарослых і дзяцей («Народная школа»), усе адукацыйныя функцыі адыйдуць да гэтага будынку. Ёсць рашэнне мясцовых жыхароў ператварыць былы Езуіцкі калегіўм у мультыкультурны кластэр з Арт-рэзідэнцыяй (у канвікце), хостэлам (у

будынку калегіўма), бізнэс-інкубатарам для творчых моладзевых ініцыятыў (у будынках былых гаспадарчых пабудоў), канцэртным холам ў будынку былога касцёла.

## 4. **Абмежаванні і магчымасці**

### 4.1 **Устаноўленая законам ахова/ абмежаванні**

Любое ўмяшанне на а'ект адбываецца ў адпаведнасці з вызначанымі заканадаўствам патрабаваннямі і абмежаваннямі, якія дачыцца захавання гісорыка-культурнай каштооўнасці першай катэгорыі.

Ансамбль Езуіцкага калегіўма размешчаны ў гістарычным цэнтры горада Мсціслава. Любая праца па будаўніцтве, мадэрнізацыі, рэстаўрацыі і рамонту павінна ажыццяўляцца на падставе праекта зон аховы гістарычнага цэнтра, распрацаваны ў рамках дэталёвага праекта рэгенерацыі цэнтральнай часткі горада Мсціслава (Праект 40.08-00.ГМ-10, УП "BELNIIPRGADOSTROITELSTVA").

Праект рэстаўрацыі і добраўпарадкавання аб'екта, згодна заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, павінен быць узгоднены з дзяржаўнымі органамі, адказнымі за ахову спадчыны. Для помнікаў першай і другой катэгорыі такім органам з'яўляецца Міністэрства культуры.

На тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці, у ахоўнай зоне і зоне рэгулявання будынка, неабходна забяспечыць:
- кансервацыю і аднаўленне гістарычна і культурна значных будынкаў і збудаванняў;
- захаванне гістарычна складзеных планіровачнай структуры і абрысаў помніка;
- аднаўленне страчаных элементаў вулічнай сеткі ў межах ахоўных зон, або аднаўленне прыроды планіровачнай структуры - у зоне рэгулірвання забудовы;
- рэканструкцыю цалкам разбураных выбітных помнікаў архітэктуры і звычайных гістарычных будынкаў, або захаванне частак сцен і падмуркаў, якія захаваліся ў культурным пласце з арганізацыяй добраўпарадкавання тэрыторыі;
- кансервацыю, рэстаўрацыю і рэканструкцыю гістарычнага ландшафту і малых архітэктурных формаў;
- абмежаванне новага будаўніцтва ў зонах ахоўваемага ландшафту і рэгуліравання забудовы;
- ачыстку тэрыторыі ад некапитальных малакаштоўных будынкаў з прадастаўленнем традыцыйных умоў для ўспрымання гістарычнага развіцця;
- зніжэнне ўплыву самага дысгарманічнага новага будынку, які не адпавядае гістарычнаму асяроддзю, за кошт паляпшэння архітэктурнага рашэння фасадаў, арганізацыі спецыяльнага садоўніцтва і г.д. - на плошчы маёмасці і ў ахоўнай зоне;

Такім чынам, забараняецца:
- размяшчэнне новых будынкаў без ўзгаднення з дзяржаўным органам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны - па месцы знаходжання помніка і ў ахоўнай зоне;
- будаўніцтва інжынерных і іншых збудаванняў, якія не адпавядаюць вонкаваму выгляду гістарычнага асяроддзя;
- вытворчасць земляных і будаўнічых работ, за выключэннем надзвычайных сітуацый, іншых відаў эканамічнай дзейнасці без дазволу дзяржаўных органаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны - у межах помніка і ахоўнай зоны.

Любая дзейнасць, якая можа паставіць пад пагрозу цэласнасць будынкаў, згодна беларускага заканадаўства, павінна быць скаардынаваная з дзяржаўнымі органамі па ахове помнікаў, з органамі мясцовага кіравання і навуковым кіраўніком, прызначаным Міністэрствам культуры.

## 4.2 **Магчымасці для пашырэння існуючага выкарыстання і паўторнага функцыянавання**

На сённяшні дзень будынкі Езуіцкага калегіўма належаць розным ведамствам. Частка з іх адрэстаўравана і ў іх размяшчаюцца: школа мастацтваў, музычная школа, гатэль гарадскога дэпартамента адукацыі на 40 месцаў. Астатняя частка будынкаў (касцёл, аптэка, капліца) патрабуць рэстаўрацыі.

Пасля аднаўлення ўсяго архітэктурнага ансамбля плануецца змяніць яго функцыянальнае прызначэнне, прыстасаваўшы пад новыя гарадсікя патрэбы. Паколькі насупраць Езуіцкага калегіўма знаходзіцца будынак былой мужчынскай гімназіі, у якой пасля правядзення рэстаўрацыйных работ адкрыецца гарадскі адукацыйны цэнтр для дадатковай адукацыі дарослых і дзяцей (“Народная школа”), усе існуючыя сёння ў быдынках калегіўма адукацыйныя інстытуцыі (мастацкая школа і школа мастацтваў) будуць перанесены туды, а ў былым калегіўме езуітаў размесціцца мультыкультурны кластэр.

Ідэя стварэння мультыкультурнага кластэра, які б задаволіў патрэбы гараджан, і асабліва – моладзі, у пашырэнні іх творчых магчымасцей, і адначасова, паспрыяў турыстычнай актыўнасці, развіццю сферы вольнага часу і мясцовага бізнэсу, належала групе мясцовых стэйхолдэраў, неадначасова выказвалася на моладзевых сустрэчах і семінарах.

Такім чынам, у былым касцёле Міхаіла Архангела мяркуецца адкрыць канцэртную залу і ўзнавіць стары арган. Каталіцкая суполка ў Мсціславе невялікая і, каб задаволіць іх рэлігійныя патрэбы досыць Кармяліцкага (Успенскага) касцёла, які працягвае выконваць сакральную функцыю. Між тым, многія гараджане выказалі жаданне мець Канцэртную залу ў горадзе, які вядомы сваім штотогадовым фестывалем класічнай музыкі. Для гэтых мэтаў велічны будынак былога касцёла падыходзіць як мага лепш.
Натуральна, што ў горадзе, які мае высокі гісторыка-культурны патэнцыял, прыгожыя ландшафты, глыбокія літаратурныя традыцыі (ад першадрукара Пятра Мсціслаўца ў 16 ст. да шматлікіх пісьменнікаў, філосафаў і вучоных, якія нарадзіліся тут) цалкам мажліва мець Арт-рэзідэнцыю, у якой маглі б спыняцца вядомыя мастакі і пісьменнікі, што, безумоўна, не толькі прынесла б пэўны даход гораду, але, галоўнае, паспрыяла б, павышэнню яго папулярнасці і развіццю іміджа культурнага цэнтра. Канвікт – былы пансіён, у якім езуіты размяшчалі вядомых гасцей, што прыязджалі да іх з усяго свету, а тасама сваіх выхаванцаў , найлепшым чынам падыходзіць да ідэі стварэння Арт-рэзідэнцыі.
У былым навучальным корпусе Езуіцкага калегіўма зараз размяшчаецца ведамасны гатэль гарадскога аддзела адукацыі, які задавальняе патрэбы толькі гэтага ведамства. Між тым, у горадзе не стае добрых гатэляў, якія б адначасова былі б даступныя для моладзі і турыстаў. З цягам часу мяркуецца, трансфармацыя існуючага гатэля ў хостэл з рознымі магчымасцямі для пражывання і адпачынку.

У былой аптэцы езуітаў размесціцца зялёная аптэка, якая адкрые магчымасці для развіцця фітатэрапіі і адначасова будзе несці музейную функцыю, расказваць пра глыбокія медыцынскія і фарматэўтычныя традыцыі мсіслаўскіх езуітаў.
Былыя гападарчыя будынкі, у якіх зараз размяшчаецца школа мастацтваў, мяркуецца прыстасаваць пад моладзевы бізнэс-інкубатар з каворкінгавай зонай для маладзевых крэатыўных праектаў.

Ансамбль Езуіцкага калегіўма дае унікальныя магчымасці для развіцця розных відаў дзейнасці і адпачынку. Дзякуючы свайму размяшчэнню ў цэнтры горада, блізка гарадскога сквера (які з'яўляецца месцам старога гарадкога рынка), ён заўсёды будзе знаходзіцца ў зоне ўвагі мясцовых жыхароў і турыстаў. Гарадскі сквер адначасова з'яўляецца выдатным месцам для правядзення розных фестываляў пад адкрытым небам, канцэртаў, рамесніцкіх кірмашоў, тэатральных перфомансаў і іншых мерапрыемтваў.

Комплекс будынкаў Ансамбля Езуіцкага калегіўма і сквер, а таксама адкрытыя прасторы паміж будынкамі дазволяць стварыць утульныя зоны для зносін і правядзення часу з сям'ёй, сябрамі, суседзямі і гасцямі горада.

Працэс аднаўлення і ўсё больш шырокае выкарыстанне Ансамбля Езуіцкага калегіўма будзе мабілізоўваць розныя часткі мясцовай супольнасці і павышаць узровень грамадзянскага ўдзелу. Даход можа быць атрыманы ад камерцыйнай дзейнасці і турызму. Ансамбль цесна звязаны з гістарычным цэнтрам горада, які з'яўляецца адной з галоўных турыстычных славутасцяў Мсціслава.

Рэалізацыя праекта будзе адпавядаць прынцыпам і практыцы ўстойлівага развіцця гарадоў, заахвочваючы адаптыўнае паўторнае выкарыстанне існуючай гісторыка-культурнай спадчыны і захаванне цэласнасці культурнага ландшафту.

## 5. **Апісанне праекта**

### 5.1 **План праекта**

#### *5.1.1 Аб'ём і задачы праекта*

Асноўная мэта праекта - адрадзіць цэнтральную культурную, адукацыйную і рэкрэацыйную функцыю ансамбля Езуіцкага калегіўма ў кантэксце сцвярджэння ролі горада Мсціслава як рэгіянальнага культурнага і турыстычнага цэнтра.

Канкрэтныя мэты:

1. Аднаўленне спадчыны комплексу і паляпшэнне яго інфраструктуры;
2. Развіццё крэатыўнага сектара ў горадзе;
3. Развіццё маладзёжных ініцыятыў, падтрымка малога бізнэсу;
4. Стварэнне новых партнёрстваў на аснове культуры, спадчыны і адукацыі;
5. Павышэнне ступені ўдзелу і супрацоўніцтва мясцовай супольнасці, іх кансалідацыі;
6. Павышэнне якасці правядзення вольнага часу для мясцовых жыхароў, у адпаведнасці з патрэбамі сучаснага грамадства;
7. Адкрыццё новых рабочых месцаў;
8. Стварэнне дынамічнага культурнага і гістарычнага ландшафту, які інтэгруе гістарычную ідэнтычнасць з новымі выгодамі;
9. Стварэнне сеткі злучаных адкрытых прастор, неабходых для правядзення вольнага часу і правядзення публічных мерапрыемстваў;
10. Стварэнне якаснага камфортнага асяроддзя для пражывання мясцовай супольнасці;
11. Развіццё турыстычных паслуг;
12. Прыцягненне новых інвестараў і партнёрскіх адносін;

13. Павышэнне іміджу горада на рэгіянальным і нацыянальным узроўнях.

Асноўнай мэтавай групай праекта з'яўляюцца мясцовыя жыхары, якія пражываюць у Мсціславе, з розных пластоў грамадства і ўзроставых груп. Праект дасць ім магчымасць сустракацца, адпачываць, набываць новыя веды, зразумець і выказаць сваю асаблівую ідэнтычнасць, раскрыць свой творчы патэнцыял.

### *5.1.2 Жаданыя вынікі*

Праект рэабілітацыі Езуіцкага калегіўма будзе мець відавочныя сацыяльна – культурныя і эканамічныя прэферэнцыі для ўсяго горада і асабліва – для моладзі.

<u>Колькасныя вынікі:</u>

1. Будынкі Езуіцкага калегіуму будуць адноўлены і прыстасаваныя пад новыя функцыі.
2. Створаны новыя пастаянныя працоўныя месцы, з магчымасцю стварэння часовых працоўных месцаў;
3. Больш за 2200 м2 нявыкарыстаных паямшканняў задзейнічаны ў культурнай, рэкрэацыйнай і камерцыйнай дзейнасці;
4. Створана новая ўтульная і даступная інфраструктура для размяшчэння гасцей горада і турыстаў (хостел на 40 месцаў);
5. Створаны ўмовы для падтрымкі крэатыўнага бізгэсу і моладзевых ініцыятыў;
6. Даходы ўстановы павялічваюцца на 150 000 € ў год;
7. Колькасць наведвальнікаў, у тым ліку міжнародных турыстаў, павялічваецца.

<u>Якасныя вынікі:</u>

1. Павышэнне вядомасці і прывабнасці горада на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях;
2. Паляпшэнне ўмоў для развіцця мясцовага малога і сярэдняга бізнэсу, маладзёвых ініцыятыў;
3. Павышэнне прывабнасці для замежных інвестараў;
4. Станоўчае ўздзеянне на прылеглыя тэрыторыі (гістарычны цэнтр, дарожная інфраструктура);
5. Станоўчы прыклад рэабілітацыі для іншых населеных пунктаў;
6. Павелічэнне колькасці і разнастайнасці камерцыйнай дзейнасці;
7. Павышэнне ўзроўню талерантнасці і ўдзелу мясцовай супольнасці;
8. Пашырэнне міжкультурнага абмену;
9. Новыя працоўныя месцы і даходы для мясцовага насельніцтва і ўладаў;
10. Скарачэнне эміграцыі і павелічэнне колькасці жыхароў;
11. Павышэнне якасці жыцця;
12. Пашырэнне магчымасцей для трансгранічнага супрацоўніцтва.

### *5.2 Кароткі агляд канцэпцыі праекта*

Будынкі ансамбля Езуіцкага калегіўма маюць вялікі патэнцыял для набыцця новых функцый, якія адпавядаюць патрабаванням сацыяльна-культурнага развіцця горада.

Праект прадугледжвае поўную рэабілітацыю Езуіцкага калегіўма ў Мсціславе, кансервацыю і рэстаўрацыю будынкаў, інтэр’ераў, насценнага роспісу (калі знойдзецца), а таксама добраўпарадкаванне акаляючай тэрыторыі.

Прыставанне будынкаў Езуіцкага калегіўма плануецца з улікам сацыяльна-культурных патрэб горада. Ідэя – стварэнне мультыкультурнага кластэра, які будзе ўключаць невялікі хостел на 40 месцаў, арт-рэзідэнцыю, бізнэс-інкубатар для крэатыўных маладзежных ініцыятыў, каворкінгавую зону , канферэнц-зону, невялікую выставачную залу, кавярню. Касцёл плануецца рэстаўраваць пад канцэрную залу з арганам.

## 6. **Распрацоўка праекта**

### 6.1 **Ацэнка дзейнасці**

Мяркуецца, што праект рэабілітацыі [1]будзе рэалізоўвацца на працягу 6 гадоў. Прапанаваная часовая шкала і фазіраванне з'яўляюцца абагульненымі:

Фаза 1 - Рэабілітацыя добраўпарадкавання тэрыторыі комплексу і сквера, што прымыкае – 1- 2 год.
Фаза 2 - Рэабілітацыя аптэкі – 1-2 год.
